# Эдзі Агняцвет

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Агняцвет Эдзі (сапр. Каган Эдзі), нарадзілася 11.10.1913 г. у горадзе Менску ў сям'і служачых.

Пасля заканчэння сямігодкі працавала на менскім заводзе «Камунар» (1930), год правучылася ў менскай будаўнічай прафтэхшколе. Скончыла крытыка-творчае аддзяленне літаратурнага факультэта Менскага вышэйшага педагагічнага інстытута (1934). Завочна вучылася на педагагічным аддзяленні літфака педінстытута (1934-1936), працавала рэдактарам Беларускага радыё (1934-1938), кансультантам у кабінеце маладога аўтара СП БССР (1939), у аддзеле паэзіі часопіса «Полымя рэвалюцыі» (1940-1941). У час Вялікай Айчыннай вайны жыла ва Ўзбекістане. У 1945-1946 гг. працавала ў Дзяржаўным выдавецтве БССР. Сябра СП СССР з 1937 г.

Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Першыя вершы надрукавала ў 1929 г. Піша пераважна для дзяцей. Выдала зборнікі паэзіі «Маё пакаленне» (1935), «Вершы» (1938), «Вясновай раніцай» (1941), «Край мой родны» (1945), «Дарога ў будучыню» (1949), «Беларуская рабіна» (1959), «Лірыка» (1965), «Круглы год: Выбранае» (1966), «Жаданне» (1971), «Спадзяванне калыханак» (1983), «Закаханым» (1986), паэму «На беразе Волгі» (1940). Выйшлі кнігі паэзіі для дзяцей «Васількі» (1947), «Ля піянерскага кастра» (1952), «Твае таварышы» (1957), «Госць з далёкай зямлі» (1958), «Незвычайныя канікулы» (1962), «Першы ліст» (1966), «Падарожнік» (1969), «Піянерская гама» (1970), «Краіна маленства» (1975), «Мы сур'ёзныя, мы вясёлыя» (1976), «Доктар Смех» (1977), «Ад зярнятка да вясёлкі» (1981), «Хто пачынае дзень?» (1982), «На двары алімпіяда» (1984), «Буду настаўнікам» (1990), паэмы «Песня пра піянерскі сцяг» (1949), «Мы будзем сябраваць» (1955, дапрацаванае выданне ў 1979), кніга для чытання ў 4 класе «Роднае слова» (з Я.Івашуціч, 1989). У 1976 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Эдзі Агняцвет піша для дзяцей і дарослых. У сучаснай беларускай дзіцячай літ-ры ёй належыць адно з першых месц. Тэматыка вершаў і паэм Эдзі Агняцвет досыць шырокая. Яна пісала пра ўсе праявы дзіцячага жыцця: Айчынная вайна з яе трагедыямі і незагойнымі ранамі; гераізм дзяцей і дарослых; адбудова разбуранай сталіцы - Мінска; мірная стваральная праца, якая робіць цуды; дружба, інтэрнацыянальная еднасць працоўных; піянерскае дзяцінства. У яе творчасці для дзяцей і юнацтва ёсць розныя жанры: лірычны, апавядальна-сюжэтны, сатырычны вершы, верш-дыялог, пес-ня,館 опернае лібрэта, паэма. Дзіц. паэмы часцей за ўсё ўслаўляюць гераічнае ў нядаўняй гісторыі нашага народа, выхоўваюць у дзяцей смеласць, мужнасць.

Паэтызацыя радзімы, прыгажосці роднага краю характэрна для паэзіі Эдзі Агняцвет. Пачуццё прыроды ў Эдзі Агняцвет асаблівае. Часам прырода ў яе творах адухаўляецца, надзяляецца чал. якасцямі. У кожным творы раскрыв-ца цуды прыроды, яе разнастайнасць, але галоўнае, што яна падштурхоўвае юнага чытача заўважаць гэтую прыгажосць, цаніць яе. Актыўнае ўзаемадзеянне з прыродай гартуе дух маладога пакалення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ










РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Аўтар лібрэта опер для дзяцей «Джанат» (1962, ставілася ў 1944, 1947, 1974), «Марынка» (урыўкі ў 1958, пастаўлена ў 1956).

Пераклала на беларускую мову паасобныя творы А.Пушкіна, М.Някрасава, У.Маякоўскага, М.Ушакова, Г.Ахматавай, В.Шэфнера, А.Барто, Л.Украінкі, М.Бажана, Я.Судрабкална, С.Карыма і інш., кнігу Зульфіі «Такое сэрца ў мяне» (з А.Грачанікавым, 1985), зборнікі паэзіі для дзяцей Я.Османіса «Сабака з рагаткай» (1976), Г.Сулейманавай «Сорак косак» (1982), М.Джаліля «Я гляджу на зоры» (1985). З французскай мовы пераклала кнігі П.Ж.Беранжэ «Выбраныя песні» (1960), «Краіна Паэмія» (анталогія французскай паэзіі для дзяцей, 1962), А.Экзюперы «Маленькі прынц» (1969), Г.Апалінэра «Зямны акіян» (1973), П.Элюара «З табою» (1980).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ




**У 1986 г. узнагароджана міжнародным Ганаровым дыпломам імя Х.К.Андэрсена за кнігу вершаў і перакладаў для дзяцей «На двары алімпіяда».**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ